Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага

20.12.2018

Прэзентацыя факсімільнага выдання “Буквара”

20 снежня 2018 года ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я.Ф.Карскага (вул. Замкавая, 20, зала пасяджэнняў) адбудзецца прэзентацыя факсімільнага выдання першага ў свеце “Буквара” на славянскай мове. Пачатак – у 14.00.

Першая ў свеце кніга пад назвай “Буквар” была выдадзена 24 ліпеня 1618 года на царкоўнаславянскай мове ў тыпаграфіі Віленскага праваслаўнага брацтва Святога Духа ў Еўе (зараз літоўскі горад Вевіс), якое было адным з буйнейшых выдавецтваў у Вялікім Княстве Літоўскім. На сённяшні дзень захавалася толькі два экзэмпляры старажытнага помніка асветніцкай думкі Беларусі, да 400-годдзя якога Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі рэалізаваны міжнародны навуковы праект па яго факсімільным узнаўленні.

Падчас прэзентацыі “Буквара” з удзелам ініцыятара праекта, кандыдата культуралогіі, намесніка дырэктара НББ Сушы Аляксандра Аляксандравіча, адбудзецца ўрачыстая перадача выдання ў дар публічным бібліятэкам, навучальным установам, музеям, рэлігійным арганізацыям Гродзеншчыны.

Даведкі па тэл.: 71 89 42, 71 89 44.